Шыфр:____________________________

Колькасць балаў:_________________

Месца:______________________

**Зацвярджаю**

**Намеснік старшыні арганізацыйнага камітэта намеснік Міністра адукацыі**

_____________ **К.С. Фарыно**

«__2__» ____03______2012 года

# ЗАКЛЮЧНЫ ЭТАП XXVIII РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ ВУЧНЯЎ УСТАНОЎ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ, ПРАФЕСІЙНА-ТЭХНІЧНАЙ І СЯРЭДНЯЙ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

## КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Магілёў, 2012 г.*

**10 клас**

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

**1 варыянт**

**Заданне 1.** Выпішыце пары рускіх і беларускіх слоў, у якіх націск падае на розныя склады.

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

***Узор:*** *зáячий – заéчы.*

Занятость – занятасць, запаянный – запаяны, звуковой – гукавы, обувщик – абутнік, прадедовский – прадзедаўскі, преуменьшенный – пераменшаны, пригород – прыгарад.

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ:_______________________________________________

_______________________________________________________________

**Заданне 2.** Укажыце нумары характарыстык, уласцівых для фразеалагізмаў.

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

| | |
|---|---|
| 1. | Выступаюць у ролі аднаго члена сказа; |
| 2. | кампаненты фразеалагізма незамяняльныя; |
| 3. | вывучаюцца тэрміналогіяй; |
| 4. | кожны раз у тэксце ствараюцца нанова; |
| 5. | не выконваюць сінтаксічную функцыю; |
| 6. | устойлівыя; |
| 7. | складаюцца з двух ці болей слоў. |

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ:_______________________________________________

**Заданне 3.** Запішыце 5 слоў, якія ўтвораны пры дапамозе суфіксаў *-ік-/-ык-* і маюць значэнне *'назвы навуковых дысцыплін, навуковых і грамадска-палітычных напрамкаў'.*

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| № п/п | Словы |
|---|---|
| 1. | |
| 2. | |
| 3. | |
| 4. | |
| 5. | |

**Заданне 4.** Запоўніце табліцу, размеркаваўшы словы *агнец, атаман, вяшчаць, кавун, крэўны, кутас, нагайка, пэндзаль, сейм, улада, футра, юны* па адпаведных групах запазычанай лексікі.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| Запазычанні з польскай мовы | Запазычанні з стараславянскай мовы | Запазычанні з цюркскіх моў |
|---|---|---|
| | | |

**Заданне 5.** Запоўніце табліцу, пераклаўшы ніжэй прыведзеныя назоўнікі на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – 8.*

Облучок, часы, жмых, дышло, зябь, покров, дань, жребий.

| Назоўнікі беларускай мовы | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **м. род** | **ж. род** | **н. род** | **множналікавы** | **граматычныя характарыстыкі беларускіх і рускіх назоўнікаў супадаюць** |
| | | | | |

**Заданне 6.** Адзначце нумары дзеяслоўных пар, якія выступаюць як суадносныя паводле катэгорыі трывання. Выбар патлумачце.

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

1) Класціся – легчы, 2) загадваць (*кіраваць*) – загадаць, 3) прадугледжваць – перагледзець, 4) пісаць – распісаць, 5) браць – узяць.

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ: ______________________________

АБГРУНТАВАННЕ: ______________________________

**Заданне 7.** Вызначце структурныя тыпы прыказак і прымавак.

*Максімальная колькасць балаў - 5.*

1) Усе бабры дабры, адно выдра – ліха яе бяры; 2) Калі б ведаў, дзе павалішся, то абышоў бы; 3) Па дарозе ідучы, грыбоў не набярэш. 4) Вольнаму воля, шалёнаму поле; 5) Дождж у пару што золата.

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ:
1. ______________________________
2. ______________________________
3. ______________________________
4. ______________________________
5. ______________________________

**Заданне 8.** Вызначце, якім літаратуразнаўчым паняццям адпавядаюць наступныя азначэнні.

*Максімальная колькасць балаў - 3.*

**А)** Невялікая "казачка" павучальнага характару, у якой героямі выступаюць прадстаўнікі жывёльнага свету, неадушаўлёныя прадметы, людзі. Гэтая забаўная гісторыя алегарычнага вытлумачэння з'яўляецца ілюстрацыяй да вядомага жыццёвага або маральнага правіла.

**Правільны адказ:**______________________________

**Б)** Гэты верш узнік у старажытнай французскай паэзіі, назву яго звязваюць з "Раманам пра Аляксандра Македонскага" (XII ст.), які напісаны такім вершам. Пішацца ён шасцістопным ямбам з цэзурай пасля трэцяй стапы. Радкі рыфмуюцца папарна, раўнамерна чаргуюцца мужчынскія і жаночыя рыфмы.

**Правільны адказ:**______________________________

**В)** Паходжанне тэрміна звязана з практыкай ранняга кнігадрукавання, дзе рыфмаваныя радкі пазначаліся чырвонай фарбай, а нерыфмаваныя — звычайнай. Калі ва ўсім вершы не было рыфмаў, ён друкаваўся звычайнай фарбай і называўся… (?)

**Правільны адказ:**______________________________

**Заданне 9.** Вызначце, хто з пералічаных беларускіх пісьменнікаў з'яўляецца аўтарам прыведзенага верша. Выбар абгрунтуйце.

*Максімальная колькасць балаў – 4 (2 – за правільны адказ, 2 – за абгрунтаванне)*

На усходзе неба грае
Пераліўным блескам.
Сыпле золата над гаем
І над пералескам.

Чуць-чуць дрогне, прыліецца
Чырвань на усходзе –
Гэта неба усміхнецца
Людзям і прыродзе.

Смех адказны, смех шчаслівы
Ходзіць па пагорках.
Час світання – час зычлівы...
Гаснуць, нікнуць зоркі.

Шырай, шырай заранiца
Разнімае крылле.
Нібы пожар б'е крыніцай
Там, на небасхіле.

Сноп праменняў, пышна ўзняты,
Сее бляск-чырвонцы –
Гэта неба сцеле шаты
На дарогу сонцу.

Над палямі мрок прарваўся,
Па нізах расплыўся,
Лес туманам заснаваўся,
Луг расой абмыўся.

Агнявыя валаконцы
Ткуцца ў шоўк чырвоны –
Гэта хмаркі ладзяць сонцу
І дзяньку кароны.

Як прыемна пахне збожжа!
А вакол – спакойна!
Эх, як слаўна, як прыгожа,
Хораша, прыстойна!

І сабрала неба фарбы
Колераў дзівосных...
І дзе ёсць такія скарбы
Гожства, сугалосся?!

А) Янка Купала
Б) Цётка
В) Якуб Колас
Г) Максім Багдановіч

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ:________________________

**Абгрунтаванне:**

**Заданне 10.** Ніжэй прыводзіцца арыгінальны тэкст класічнай рускай літаратуры і яго пераклад на беларускую мову. У асобных радках перакладу зроблены пропускі. Пастарайцеся ўзнавіць версію перакладчыка і / або прапанаваць уласную. Пры стварэнні ўласнага варыянта (варыянтаў) дазваляецца поўнасцю змяняць радок, у якім ёсць пропуск, галоўнае – захаваць мастацкую цэласнасць твора

*Максімальная колькасць балаў - 8 (па 2 балы за кожны адпаведны варыянт).*

Ночевала тучка золотая
На груди утёса-великана,
Утром в путь она умчалась рано,
По лазури весело играя;

Но остался влажный след в морщине
Старого утёса. Одиноко
Он стоит, задумался глубоко,
И тихонько плачет он в пустыне.

М.Ю. Лермонтов. *«Утёс».*

Начавала хмарка залатая
На____________________,
І ў дарогу ____________,
Ведала, бакіт яе чакае;

Ды вільготны след пякуча стыне
У аброва ў зморшчыне. Самотна
Ён стаіць, __________________,
Непачута плачучы ў пустыні.

*Пераклад Рыгора Барадуліна*

**Уласныя версіі**

**2-і радок:**________________________________________________________

**3-і радок:** ________________________________________________________

**7-ы радок:** _______________________________________________________